ведывательно-поисковые группы с целью активного поиска и ликвидации бандитов [2, с. 354].

Таким образом, борьбу органов НКВД-НКГБ после освобождения территории Беларуси от немецко-фашистских захватчиков в первые послевоенные годы с антисоветскими элементами и бандитскими группировками можно назвать масштабной, методы ее были достаточно эффективны и включали в себя действия боевых подвижных отрядов, специальные оперативно-войсковые операции и агентурное внедрение в преступные сообщества.

**Список основных источников**

1. Милиция Беларуси. Документы и материалы (1917–2007 гг.) / сост. К. И. Барвинок [и др.] ; под ред. канд. ист. наук, доц. К. И. Барвинка, д-ра ист. наук, проф. А. Ф. Вишневского; авт. ист. очерка К. И. Барвинок, А. Ф. Вишневский ; М-во внутр. дел, Акад. МВД. — Минск : Акад. МВД Респ. Беларусь, 2007. — 352 с.

2. ОУН-УПА в Беларуси. 1939–1953 гг.: документы и материалы / сост. В. И. Адамушко [и др.] ; редкол.: В. И. Адамушко [и др.]. — 2-е изд. — Минск : Выш. шк., 2012. — 528 с.

УДК 94(474/476)ВКЛ

*І. А. Хламёнак, факультэт міліцыі*
*Навуковы кіраўнік: С. В. Венідзіктаў,*
*начальнік кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін*
*Магілёўскага інстытута МУС,*
*кандыдат філалагічных навук, дацэнт*

# КРЭЎСКАЯ УНІЯ: ПАЛІТЫЧНЫЯ І САЦЫЯЛЬНЫЯ НАСТУПСТВЫ ДЛЯ ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА

Роля царквы ў сярэднявечным грамадстве заключалася ў вызначэнні зместу і рэгуляванні розных сфер жыцця, у якіх пануючае месца займаў рэлігійны светапогляд. У XII–XIII ст. Вялікае Княства Літоўскае (далей — ВКЛ) знаходзілася пад манапольным уплывам праваслаўя; такая сітуацыя захоўвалася да прыняцця Крэўскай уніі ў 1385 г. Уся гісторыя народаў, што засялялі тэрыторыю сучаснай Беларусі, на працягу 400 гадоў адчувала аддалены па часе ўплыў гэтага саюза, пачатак якому быў пакладзены ў 1385 г. у замку Крэў [1]. Адпаведна, мэтай дадзенай працы з’яўляецца даследаванне ўплыву рэлігійнай сітуацыі на палітыку ВКЛ пасля падпісання Крэўскай уніі. Аб’ектам даследа-

вання выступаюць грамадскія адносіны ў рэлігійнай сферы, абумоўленыя афіцыйнай палітыкай дзяржавы.

У сувязі з заключэннем у 1385 г. Крэўскай уніі рэлігійная палітыка ВКЛ у дачыненні да царквы змянілася: да гэтага ў Княстве была толькі адна хрысціянская канфесія — праваслаўе, да якой належала насельніцтва беларускіх, украінскіх і рускіх зямель; вялікія князі літоўскія да 1385 г. былі ў асноўным паганцамі. Па ўмовах уніі паганскае насельніцтва ВКЛ павінна было прыняць хрышчэнне паводле каталіцкага абраду. Ужо ў 1387 г. феадалы, якія прынялі каталіцтва, атрымалі прывілеі, што, зразумела, выклікала абурэнне з боку праваслаўных феадалаў. Шлюбы паміж каталікамі і праваслаўнымі забараняліся. Яшчэ большыя правы атрымалі каталікі згодна з умовамі Гарадзельскай уніі 1413 г.: з гэтага часу толькі яны маглі займаць найвышэйшыя дзяржаўныя пасады. Такая палітыка, на наш погляд, абвастрала становішча ў дзяржаве, надавала ўнутраным сацыяльна-палітычным канфліктам рэлігійную афарбоўку. У 1432–1438 гг. у перыяд грамадзянскай вайны ўлады былі вымушаны зраўнаваць праваслаўных і каталікоў у большасці правоў, аднак палажэнне аб займанні найвышэйшых дзяржаўных пасад толькі каталікамі фармальна дзейнічала да 1563 г.

У Прывілеі 1432 г. праваслаўным феадалам надаваліся роўныя з каталікамі эканамічныя і сацыяльныя (але не палітычныя) правы, што павінна было спрыяць кансалідацыі пануючага саслоўя ў справе абароны дзяржавы і стварыць прававыя перадумовы для вылучэння феадалаў у прывілеяванае саслоўе шляхты, аб’яднаўшы яго на класавай аснове незалежна ад веравызнання. Увогуле Земскім прывілеем 1434 г. пацвярджаліся роўныя правы феадалаў-праваслаўных з феадаламі-каталікамі. Усім феадалам гарантавалася права валодання маёнткамі і перадача іх па спадчыне альбо на іншых законных падставах. Залежныя ад феадалаў людзі вызваляліся ад некаторых дзяржаўных павіннасцей. У прывілеі пацвярджалася права праваслаўных феадалаў карыстацца гербамі і іншымі знакамі шляхецтва, вялікі літоўскі князь пазбаўляўся права караць, грунтуючыся на таемным даносе ці абвінавачанні. Судовыя справы павінны былі разглядацца публічна ў судзе ў адпаведнасці з законамі ВКЛ [2].

У XV ст. у Еўропе пачалі распрацоўвацца планы ўз’яднання хрысціянскай царквы, расколатай на дзве часткі — каталіцтва і праваслаўя. Планы царкоўнай уніі набылі падтрымку вялікага князя літоўскага Вітаўта (гэтаму спрыяў шматнацыянальны склад насельніцтва ВКЛ і жаданне князя, не губляючы сувязі з каталіцкай Еўропай, пашырыць свой уплыў на праваслаўную Русь [3]). Поспех царкоўнай уніі дазволіў бы знівеліраваць супярэчнасці паміж праваслаўным і каталіцкім насельніцтвам ВКЛ і ператварыў бы яго ў наймацнейшы хрыс-

ціянскі фарпост на ўсходзе Еўропы. Пазней ідэю царкоўнай уніі падтрымаў вялікі князь Свідрыгайла.

У 1439 г. унія паміж каталіцкай і праваслаўнай цэрквамі была складзена на Царкоўным саборы ў Фларэнцыі. Аднак у ВКЛ яго рашэнні не набылі шырокай падтрымкі, бо кіраўніцтва каталіцкай царквы не хацела дзяліцца з праваслаўнай царквой правамі і прывілеямі. Не ўхваліў унію і новы вялікі князь літоўскі Казімір Ягайлавіч. Захоп Канстанцінопаля туркамі ў 1453 г. пазбавіў пытанне аб уніі актуальнасці, але спробы рэалізаваць палажэнні Фларэнтыйскай уніі ў Вялікім Княстве Літоўскім рабіліся і пазней: напрыклад, на мяжы XV і XVI ст. вялікім князем Аляксандрам [1].

У першай палове XVI ст. рэлігійная сітуацыя ў ВКЛ стала змяняцца. Прадстаўнікі праваслаўнай шляхты ўсё часцей дапускаліся да вышэйшых дзяржаўных пасад, што парушала ўмовы Гарадзельскай уніі 1413 г. Гэта павінна было супакоіць праваслаўнае насельніцтва, павысіць яго давер да цэнтральнай улады. Далейшае паслабленне пазіцый каталіцкай царквы было звязана з пранікненнем у ВКЛ пратэстанцкіх ідэй. Прыхільнікам верацярпімасці быў вялікі князь Жыгімонт ІІ Аўгуст, які нават падтрымаў ідэю стварэння Народнага сабору, дзе аб’ядналіся б прадстаўнікі ўсіх накірункаў хрысціянства. Да сярэдзіны XVI ст. у ВКЛ усталявалася адносная рэлігійная талерантнасць. У 1563 г. быў прыняты прывілей, згодна з якім феадалы каталіцкай і праваслаўнай канфесій ураўноўваліся ў правах.

Такім чынам, палітычнымі наступствамі Крэўскай уніі для Вялікага Княства Літоўскага стала пераразмеркаванне ў кіруючых элітах і змяненне вектару рэлігійнай палітыкі, сацыяльнымі — абвастрэнне супярэчнасцей паміж хрысціянскімі канфесіямі. Умовы уніі дзейнічалі да 1569 г., калі Люблінская унія аб’яднала ВКЛ і Каралеўства Польскае ў канфедэратыўную абмежаваную манархію.

## Спіс асноўных крыніц


1. Доўнар, Л. І. Гісторыя беларускай кнігі : вучэбны дапаможнік для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў / Л. І. Доўнар. — Мінск : БДУКМ, 2012. — 250 с.

2. Городельская уния и её последствия [Электронный ресурс] // История Киева. — Режим доступа: http://kiev-history.com.ua/index.php?option=com_content&view=article&id=70:2011-02-21-14-05-04&catid=16:2011-02-04-22-11-26&Itemid=26. — Дата доступа: 01.04.2017.

3. Великое княжество Литовское, Русское и Жемойтское [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://vklby.com/index.php/diplomatiya/17-diplomatiya. — Дата доступа 01.04.2017.